Установа адукацыі
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_____________________ С.Л. Шпарло
____10.10.______2022 г.
Рэгістрацыйны № ВД-398/эвуч.

# СУЧАСНАЯ СВЯТОЧНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках)*

Вучэбная праграма складзена на падставе:
вучэбных планаў установы вышэйшай адукацыі па напрамках спецыяльнасці: 1-17 01 05-01 Рэжысура свят (народныя), рэгістрацыйны № С17-1-28/21уч. ад Рэжысура свят (тэатралізаваныя), рэгістрацыйны № С17-1-17/21уч. ад

на падставе адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі, зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 12.04.2022 №78 па спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках).

**СКЛАДАЛЬНІК**
*А. В. Катовіч*, старшы выкладчык кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*Л.С.Кажухоўская*, прарэктар па міжнароднай і навукова-метадычнай рабоце Дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы», кандыдат культуралогіі;
*А.І.Смолік,* загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар культуралогіі, прафесар;

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 10 ад 27.05.2022);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 15.06.2022)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Сучасная святочная культура Беларусі» – адна са спецыяльных дысцыплін, выкладанне якой накіравана на падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне святочнай культуры, і з’яўляецца адной з вучэбных дысцыплін адукацыйнага модуля «Святочная культура Беларусі».

Змест дысцыпліны непасрэдным чынам звязаны з вывучэннем шэрагу іншых спецыяльных дысцыплін, перш за ўсё «Гісторыя свят», «Традыцыйная святочная культура», «Сучасныя формы святочнай культуры», «Асновы мастацкага афармлення свят і відовішчаў», «Рэжысура фальклорных прадстаўленняў», «Рэжысура тэатралізаваных прадстаўленняў і свят», «Музычна-шумавое вырашэнне свят» і інш. Выкладанне дысцыпліны ва ўзаемасувязі з іншымі дазваляе ў поўнай меры сфарміраваць у студэнтаў спецыялізаваную кампетэнцыю: Ствараць сучасныя святы з улікам пераемнасці культурных і гістарычных традыцый Беларусі.

*Мэта* выкладання вучэбнай дысцыпліны «Сучасная святочная культура Беларусі» – раскрыць духоўна-эстэтычны, маральна-выхаваўчы і сацыякультурны патэнцыял сучасных святочных традыцый беларускага народа ў захаванні ўстойлівага развіцця этнасу на сучасным этапе развіцця грамадства.

*Задачы вучэбнай дысцыпліны*:

– вызначыць духоўныя, маральныя, пазнавальныя і выхаваўчыя аспекты традыцыйных рытуальна-абрадавых практык беларускага народа ў працэсе фарміравання  і развіцця сучаснай святочнай культуры Беларусі;

– раскрыць шляхі міжпакаленнай пераемнасці каляндарных і сямейна-родавых абрадаў ва ўмовах існавання традыйнага грамадства;

– вызначыць адукацыйна-выхаваўчы патэнцыял святочных традыцый беларусаў у працэсе супрацьстаяння сусветнай глабалізацыі і фарміравання нацыянальнай ідэнтычнасці сучаснай асобы;

– раскрыць спецыфіку і перспектывы суіснавання і ўзаемадапаўнення традыцыйнай духоўнай спадчыны і сучасных святочных традыцый народа;

– паказаць асноўныя тэндэнцыі фарміравання сучаснай святочнай культуры Беларусі;

– раскрыць асаблівасці суіснавання традыцыйных, сучасных гарадскіх і вясковых святочных практык;

– раскрыць духоўны патэнцыял сістэмы дзяржаўных святкаванняў у працэсе фарміравання патрыятызму, гістарычнай памяці, нацыянальнай самасвядомасці сучаснага грамадзяніна Беларусі;

– раскрыць духоўна-эстэтычны патэнцыял прафесійных свят у працэсе фарміравання карпаратыўнай этыкі, павагі да сямейных дынастый, стымулявання развіцця прафесійных кампетэнцый;

– стымуляваць пошукі шляхоў самастойнага вырашэння творчых праблем у працэсе ўвасаблення святочных дзействаў.

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

*ведаць:*

асновы традыцыйнай святочнай культуры беларусаў;

– структурна-функцыянальныя аспекты фарміравання сучасных рытуальна-абрадавых практык;

– накірункі, тэндэнцыі і перспектывы фарміравання свят сучаснай культуры Беларусі;

тэхналогіі і модулі працэсу падрыхтоўкі сучасных святочных цырыманіялаў;

*умець:*

– раскрыць логіку і паслядоўнасць паэтапнай распрацоўкі сцэнарнага плана святочнай імпрэзы;

– выкарыстоўваць псіхолага-педагагічныя прыёмы згуртавання творчага калектыву і размяркоўваць напрамкі дзейнасці удзельнікаў у адпаведнасці з мэтай і задачамі творчага праекта;

*валодаць:*

– навыкамі карыстання навуковай і даведачнай літаратурай для стварэння ўласнай базы даных аб святах і абрадах сучаснай святочнай культуры;

– методыкай раскрыцця кожнай функцыянальнай складовай рытуальна-абрадавых комплексаў сучаснай святочнай культуры.

Падчас засваення дысцыпліны «Сучасная святочная культура Беларусі» прапаноўваецца шэраг метадычных рэкамендацый, якія дазволяць студэнту скласці падрабязную структуру асноўных свят і абрадаў сучаснай святочнай культуры, якую можна будзе паспяхова выкарыстоўваць у сваёй практычнай дзейнасці.

На засваенне вучэбнай дысцыпліны «Сучасная святочная культура Беларусі», дасягненне пастаўленай мэты і вырашэння задач прадугледжана 90 гадзін, з іх аўдыторных – 54: лекцыі – 44, семінарскія заняткі – 10 гадзін. Рэкамендуемая форма кантролю ведаў студэнтаў – залік.

Працаемкасць вучэбнай дысцыпліны складае 3 заліковыя адзінкі.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны. Дзяржаўная праграма “Культура Беларусі” як вызначэнне стратэгічных кірункаў культурнага будаўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь*

Прадмет, мэта, задачы курса. Прыярытэтныя напрамкі палітыкі дзяржавы ў вобласці культурнага будаўніцтва: фарміраванне гістарычнай памяці беларускай народа, захаванне яго нацыянальна-культурнай самабытнасці шляхам папулярызацыі каштоўнасцей матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны; актыўнае далучэнне сучаснага пакалення моладзі да працэсаў захавання і развіцця культурнага патэнцыялу краіны з мэтай усебаковай рэалізацыі творчага патэнцыялу кожнай асобы; усебаковае спрыянне захаванню нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці беларускай дыяспары. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры (2016): стварэнне на базе існуючых прававых інстытутаў адзінага механізму рэгулявання адносін у сферы культуры. Напрамкі праграмы: 1. Культурная спадчына; 2. Мастацтва і творчасць; 3. Функцыянаванне і інфраструктура сферы культуры; 4. Беларусы ў сусвеце; 5. Архівы Беларусі.

## *Тэма 1. Святочная культура: культурна-гістарычныя і сацыяльна-псіхалагічныя аспекты*

Свята як сацыяльны і культурны феномен. Кансалідуючая функцыя спрадвечных і сучасных культурных традыцый. Святочная культура – асоба, соцыум – з’явы адзінай інфармацыйна-сэнсавай прасторы, якія характарызуюцца складанымі палітычнымі, гістарычнымі, культурнымі, рэлігійнымі, прыродна-геаграфічнымі і іншымі аспектамі развіцця грамадства. Канстытуіруючая роля традыцыйных і масавых свят у жыцці соцыуму. Святы як інстытуалізацыя дзяржаўнасці суверэннай Беларусі, адлюстраванне важных этапаў гістарычнага станаўлення нацыі. Новыя цырыманіялы і відовішчы, звязаныя са спецыфікай дзяржаўнага будаўніцтва (Дзень Незалежнасці, Рэспубліканскі фестываль-кірмаш “Дажынкі” і інш.).

## *Тэма 2. Трансфармацыя сучаснай святочнай культуры ў кантэксце працэсаў глабалізацыя*

Складаныя глабалізацыйныя працэсы і паступовае размыванне унікальнасці этнанацыянальнай духоўнай спадчыны. Камерцыяналізацыя працэсаў развіцця сучаснай святочнай культуры. Тэндэнцыя разбурэння традыцыйных лакальных культур, абумоўленая ўвядзеннем адзіных культурных сімвалаў, практык і каштоўнасцей, стандартызацыяй эканамічнага ўзаемадзеяння і высокім узроўнем развіцця тэхнічнага прагрэсу. Тэндэнцыі трансфармацыі святочнай культуры ў адпаведнасці з працэсамі

урбанізацыі, міжэтнічных міграцый. Каштоўнасныя канцэпты сучаснай сістэмы святкаванняў.

### *Тэма 3. Гістарычныя асаблівасці свят і абрадаў беларускага народнага календара*

Асноўныя гістарычныя, культурныя і сацыяльныя аспекты фарміравання святочных комплексаў беларускага народнага календара. Узаемасувязь міфа і рытуалу ў працэсе фарміравання сістэмы каляндарных свят. Прыродна-касмічныя асновы фарміравання структуры традыцыйнага календара. Вегетатыўны цыкл збожжавых культур – аснова земляробчага календара беларусаў. Адлюстраванне іншых сфер гаспадарчай дзейнасці ў сістэме традыцыйных каштоўнасцей народнага календара беларусаў: жывёлагадоўля, пчалярства, народная медыцына, розныя віды промыслаў і рамёстваў. Гістарычны дыялог культурна-рэлігійных традыцый: суіснаванне і ўзаемаспалучэнне народнага і хрысціянскага календароў.

### *Тэма 4. Святочная культура беларускай шляхты*

Складанасць працэсу саслоўнага афармлення беларускай шляхты ў XIV –XVI стст. Сістэма каштоўнасцей (рэлігійная самасвядомасць, этычныя нормы, эстэтычныя густы), на аснове якіх фарміравалася культура шляхецкага саслоўя. Вытокі і развіццё на розных гістарычных этапах паратэатральных дзей шляхецкага саслоўя: тэатралізаваныя шэсці, піры, паляванні, пахаванні. Структура, выразныя сродкі і семантыка дзей канфесійных і свецкіх тэатралізаваных шэсцяў, абрадаў. Асаблівасці, выразныя сродкі і кампазіцыйная пабудова імянін, дзён нараджэнняў і вяселляў прадстаўнікоў беларускай шляхты. Рытуальныя сустрэчы каранаваных асоб, магнатаў. Тэатралізаваныя дзеі паляванняў.

### *Тэма 5. Станаўленне і развіццё савецкіх масавых свят*

Гісторыя навуковага асэнсавання святочнай культуры СССР. Савецкі святочны каляндар. Гістарычная міфалагізацыя савецкіх святаў. Своеасаблівае пераасэнсаванне рэлігійнай і сялянскай абраднасці. Класіфікацыя свят ў СССР.

Правілы правядзення дэманстрацый у пралетарскія святы. Дэманстрацыі і маёўкі ў 1920–30-я гг. у г.г. Мінск, Віцебск, Магілёў, Гомель.

Традыцыі і спецыфіка святкавання дат савецкай гісторыі. Дэманстрацыі, мітынгі, шэсці, канцэрты, жывыя карціны, імправізаваныя суды, тэатралізаваныя карнавалы, харавыя дэкламацыі як формы паяднання інфармацыйна-прапагандысцкага матэрыялу з мастацкай вобразнасцю.

Новыя формы масавых урачыстасцяў 1940–70-х гг. Віды фестываляў. Дэкады нацыянальнага мастацтва. Святы прафесій. Дзіцячыя, юнацкія і моладзевыя святы. Тэатралізаваныя мастацка-спартыўныя прадстаўленні і

інсцэніроўкі. Сінтэтычны характар як вызначальная рыса новых форм масавых урачыстасцей. Асаблівасці ўпрыгожвання вуліц і плошчаў.

### *Тэма 6. Сямейна-родавая абраднасць беларусаў на сучасным этапе*

Новае афармленне традыцыйных абрадаў жыццёвага цыклу. Параўнальны аналіз традыцыйных і сучасных абрадавых дзеянняў беларускага вяселля, пахавання, радзін. Змены ў структуры традыцыйных абрадаў: страта рэгіянальных асаблівасцей, скарачэнне часу правядзення; спрошчанасць ключавых абрадавых дзеянняў; дубліраванне працэдуры рэгістрацыі шлюбу ў загсе і вянчання ў храме; замена або страта традыцыйнай рытуальнай ежы (куцця, каравай, бабіна каша); змена ў сімволіцы і каштоўнасцях рытуальнага адзення; фармальнае выкананне сваіх абавязкаў рытуальнымі персанажамі (сватамі, шаферамі, хроснымі бацькамі); тэндэнцыя ўніфікацыі; іншакультурныя запазычанасці; інавацыі урбанізаванага асяроддзя.

### *Тэма 7. Дзяржаўныя святы Рэспублікі Беларусь*

Гістарычная абумоўленасць узнікнення традыцыі святкавання дзяржаўных святаў. Дамінуючая палітычная ідэалогія краіны. Разуменне гісторыі і часовай дынамікі, развіццё і станаўленне беларускага народа як адзінага грамадскага арганізма.

Гісторыя, сэнс і структура дзяржаўных свят. Кампаненты абрадава-рытуальнай часткі: вынас сцягоў, дзяржаўнай сімволікі, ганаровы караул, святочнае шэсце, парад, мітынг, ускладанне кветак да мемарыяльных месцаў і месцаў пахаванняў, цырымонія ўрачыстага адкрыцця і закрыцця свята, урадавы канцэрт, святочны салют і інш. Узбагачэнне сродкаў святочных відовішчаў і афармлення.

Дзяржаўная і гістарычная сімволіка ў сучасных святах.

### *Тэма 8. Ваенна-патрыятычныя святы Рэспублікі Беларусь*

Ваенна-патрыятычныя святы. Ваенна-патрыятычнае выхаванне дзяцей і моладзі, накіраванае на фарміраванне патрыятычнай свядомасці, пачуцця вернасці сваёй Айчыне, гатоўнасці да выканання задач па забеспячэнні абароны Айчыны. Асноўныя формы правядзення мерапрыемстваў па ваенна-

патрыятычным выхаванні: урокі мужнасці, дні воінскай славы, мерапрыемствы па ўвекавечанні памяці загінуўшых у барацьбе за незалежнасць нашай Радзімы (штогадовая Вахта памяці каля Вечнага агню 9 мая, добраўпарадкаванне воінскіх пахаванняў і інш.), сустрэчы з ветэранамі і аказанне ім шэфскай дапамогі, тэматычныя экскурсіі ў музеі і воінскія часці, прагляд і абмеркаванне кінафільмаў ваеннай тэматыкі, квэст-гульні, спартыўна-масавыя мерапрыемствы (ваенна-спартыўныя гульні «Зарнічка», «Зарніца», спартакіяда дапрызыўнай моладзі) і іншыя патрыятычныя праекты

і конкурсы. Характарыстыка відовішчных форм: шэсце, парад, дэманстрацыя, гістарычная рэканструкцыя, фестывалі і інш.

### *Тэма 9. Станаўленне і развіццё прафесійных свят*

Генезіс прафесійных свят. Старажытныя формы прафесійных свят і іх структура. Святы рамеснікаў, прысвечаныя хрысціянскім патронам асобных карпарацый (свсв. Кузьма і Дзям’ян – апякун кавалёў, свсв. Пётр і Павел – апякун рыбаловаў і інш.).

Святочныя мерапрыемствы ў працоўных калектывах. Роля грамадскіх арганізацый. Прафесійныя дні і святы. Карпаратыўныя святы. Выкарыстанне спецыфічных знакаў і сімвалаў. Арганізацыя традыцыйных і распрацоўка новых абрадава-рытуальных дзей, прысвечаных ушанаванню прафесіі ў сучасным грамадстве.

### *Тэма 10. Станаўленне і развіццё спартыўных масавых свят*

Спаборніцтвы ў кантэксце святочнага жыцця старажытнага беларускага горада. Паходжанне і тэндэнцыі развіцця спартыўных гульняў. Баявыя практыкаванні і адзінаборствы як спосаб ваеннай падрыхтоўкі. *Рыцарскія турніры*: змест, умовы паядынкаў, мастацка-дэкаратыўнае вырашэнне, артыбутыка. Традыцыі правядзення турніра «Кароль курка» ў Слуцку, Нясвіжы, Быхаве (сярэдзіна XVII–XVIII ст.). *Конныя каруселі* ў замках і кадэцкіх корпусах Нясвіжа, Слуцка, Шклова, Гродна. Рытуал адкрыцця, мастацкае афармленне, гульнявы змест конных каруселяў. *Кірмашовыя спартыўныя забавы.*

Сучасныя спартыўныя святы. Алімпійскія, паралімпійскія гульні.

### *Тэма 11. Свята горада*

Значэнне традыцый гарадской культуры Беларусі. Святкаванне *юбілеяў заснавання беларускіх гарадоў*. Прастора і час свята. Асноўныя сімвалы свята: *герб, сцяг, гімн*. Паліфанічнасць святочнага дзеяння. Гісторыя горада, лёс яго жыхароў і гістарычны ландшафт – аснова рэжысёрскай задумы. Афіцыйныя мерапрыемствы. Структура абрадаў і цырымоній. Рэкрэацыйная прастора горада і яе напаўненне тэатралізаванымі і відовшчнымі элементамі.

Святкаванне *юбілеяў выдатных дзеячаў культуры, памятных дат*. Памятныя даты ААН: *спецыяльныя дні, тыдні, гады і дзесяцігоддзі*, прысвечаныя пэўнай тэме ці праблематыцы.

### *Тэма 12. Свята вёскі*

Вёска – скарбніца народных традыцый. Гістарычная абумоўленасць свята. Прастольнае свята. Традыцыя фэстаў (храмавых свят). Кірмашы, прымеркаваныя да хрысціянскіх свят. Сумесная праца адміністрацыі,

працаўнікоў культуры, святароў пэўнай мясцовасці. Праграма свята. Удзел жыхароў вёскі. Запрошаныя госці свята. Конкурс на лепшую сядзібу. Узнагароджванне пераможцаў працы, старэйшых жыхароў і г. д.

### *Тэма 13. Беларускі кірмаш*

Генезіс кірмашу і этымалогія назвы. З'яўленне і распаўсюджванне кірмашу на тэрыторыі Беларусі. Спецыялізацыя гандлю: агульнагаспадарчыя, конскія, рыбныя, грыбныя, ягадныя кірмашы. Кантрактавыя кірмашы і лясныя кірмашы. Сфера абслугоўвання на кірмашах. Кірмашовы тэатр. Кірмаш як сацыякультурны феномен: гасцяванні сваякоў. Традыцыі правядзення кірмашоў некалькімі вёскамі ў храналагічнай паслядоўнасці.

### *Тэма 14. Святкаванне знакамітых асоб і памятных дат краіны*

Святкаванне юбілеяў выдатных дзеячаў культуры, памятных дат. Памятныя даты ААН: спецыяльныя дні, тыдні, гады і дзесяцігоддзі, прысвечаныя пэўнай тэме ці праблематыцы.

### *Тэма 15. Народныя гульнёва-забаўляльныя праграмы: традыцыі і сучаснасць*

Каляндарна-абрадавыя (у адпаведнасці са святамі каляндарнага цыкла) і сямейна-бытавыя (вяселле, радзіны, юбілеі) народныя гульнёва-забаўляльныя праграмы. Праграмы экалагічнай накіраванасці (свята лесу, свята кветак, свята птушак, свята на вадзе). Праграмы, прымеркаваныя да свят беларускай культуры (дзень ведаў, дзень пісьменства, юбілеі памятных гістарычных падзей, свята народнай музыкі, фестываль мастацтваў, свята гумару). Праграмы па узроставым прынцыпе (дзіцячыя, падлеткавыя, маладзёжныя); па месцы правядзення (на адкрытым паветры, у памяшканні); па сюжэтнай лініі (конкурсныя, драматычныя, творчыя, спартыўныя); па характары арганізацыі калектыву (з раздзяленнем на каманды, без раздзялення).

### *Тэма 16. Шматнацыянальная культура Беларусі. Святочныя традыцыі нацыянальных меншасцей*

Святочная карта дыяспар Беларусі. Этнакультурныя і этнаканфесійныя асаблівасці існавання дыяспар на Беларусі. Этнакультурны дыялог паміж дыяспарамі і тытульным этнасам. Традыцыі святкавання навалецця ў этнічных суполках. Традыцыі сумесных святкаванняў у Доме Дружбы. Міжнацыянальныя святкаванні ў культурным цэнтры “Масква”. Этьнакультурны фестываль “Вянок Дружбы” ў г. Бабруйск. Роля і месца Фестывалю нацыянальных культур у культурным жыцці Беларусі. Каардынуючая роля Цэнтра нацыянальных культур у развіцці міжнацыянальных адносін на Беларусі.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | | |
| *Уводзіны.* Дзяржаўная праграма “Культура Беларусі” як вызначэнне стратэгічных кірункаў культурнага будаўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь | 2 | | | | |
| *Тэма 1.* Святочная культура: культурна-гістарычныя і сацыяльна-псіхалагічныя аспекты | 2 | | | | |
| *Тэма 2.* Трансфармацыя сучаснай святочнай культуры ў кантэксце працэсаў глабалізацыя | 2 | | | | |
| *Тэма 3.* Гістарычныя асаблівасці свят і абрадаў беларускага народнага календара | 2 | | | 1 | абарона рэфератаў |
| *Тэма 4.* Святочная культура беларускай шляхты | 2 | | | 1 | абарона рэфератаў |
| *Тэма 5* Станаўленне і развіццё савецкіх масавых свят | 4 | | | 1 | абарона рэфератаў |
| *Тэма 6.* Сямейна-родавая абраднасць беларусаў на сучасным этапе | 2 | | | 1 | абарона рэфератаў |
| *Тэма 7.* Дзяржаўныя святы Рэспублікі Беларусь | 2 | | 2 | | |
| *Тэма 8.* Ваенна-патрыятычныя святы Рэспублікі Беларусь | 2 | | | 1 | абарона прэзентацый |
| *Тэма 9.* Станаўленне і развіццё прафесійных свят | 2 | | | 1 | абарона прэзентацый |
| *Тэма 10.* Станаўленне і развіццё спартыўных масавых свят | 2 | | | 1 | абарона прэзентацый |
| *Тэма 11.* Свята горада | 2 | | | 1 | абарона прэзентацый |
| *Тэма 12.* Свята вёскі | 2 | | 2 | | |
| *Тэма 13.* Беларускі кірмаш | 2 | | | 1 | абарона прэзентацый |
| *Тэма 14.* Святкаванне знакамітых асоб і памятных дат краіны | 2 | | 2 | | |
| *Тэма 15.* Народныя гульнёва-забаўляльныя праграмы: традыцыі і сучаснасць | 2 | | 2 | | |
| *Тэма 16.* Шматнацыянальная культура Беларусі. Святочныя традыцыі нацыянальных меншасцей | 2 | | | 1 | абарона рэфератаў |
| **Усяго…** | **36** | | **8** | **10** | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

### *Асноўная*

*Котович,* О. В. Сакральный мир традиции. 99 уроков народной культуры / О. Котович, Я. Крук. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2018. – 578 с.

*Махлина,* С. Т. Семиотика культуры повседневности : учеб. для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям / С. Т. Тевельевна. - 2-е изд., доп. - Москва : Юрайт, 2020. – 253.

*Монина,* Н. П. История и теория праздничной культуры [Электронный ресурс] : учеб. пособие : в 6 частях [16+] / Н. П. Монина ; Омский государственный университет им. Ф. М. Достоевского. – Омск : Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского (ОмГУ), 2019. – Часть 6. История праздничной культуры России Нового и Новейшего времени. – 220 с. – Режим lоступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=575856

### *Дадатковая*

Беларусы : у 12 т. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск : Беларус. навука. – Т. 5 : Сям'я / В.К. Бандарчык [і інш.]. – 2001. – 375 с.

Беларусы : у 12 т. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск : Беларус. навука. – Т. 6 : Грамадскія традыцыі / В. Ф. Бацяеў [і інш.]. – 2002. – 606 с.

Беларуская вуснапаэтычная творчасць: падруч. для студэнтаў філал. спец. ВНУ / К.П. Кабашнікаў [і інш.]. – 2-е выд., перапрац. – Мінск: Лексіс, 2000. – 512 с.

Беларуская міфалогія : энцыкл. слоўнік / рэдкал.: С. Санько (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. І. Клімковіч. – 2-е выд., дап. – Мінск : Беларусь, 2006. – 599 с.

Беларускі фальклор: хрэстаматыя / склад. К.П. Кабашнікаў [і інш.]. – Мінск: Вышэйшая школа, 1985. – 749 с.

Беларускі фальклор: энцыклапедыя: у 2 т. / рэдкал.: Г.П.Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭН, 2005–2006.

Беларусы: Т. 7: Вусная паэтычная творчасць / НАНБ; Г. А. Барташэвіч, [і інш.]; рэдкал.: В.М. Бялявіна[і інш.]. – 2004. – 586 с.

Беларускі народны каляндар / аўт.-уклад. А. Ю. Лозка. – Мінск : Полымя, 1992. – 205 с.

*Валодзіна, Т.В.* Семантыка рэчаў ў духоўнай спадчыне беларусаў / Т.В. Валодзіна. – Мінск, 1999. –160 с.

*Грамадскі* быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі / В.К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 256 с.

Гульні, забавы, ігрышчы / рэдкал.: А.С.Фядосік [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 1996. – 534 с.

*Гуд, П. А.* Ад Каляд да Пакроваў / П. А. Гуд ; рэд.-склад. Л. І. Жук. – Мінск : Красіка-Прынт, 2000. – 223 с. – (Беларусь святочная).

*Гуд, П. А.* Беларускі купальскі комплекс і семантыка абрадавых дзей / П. А. Гуд. – Мінск : Тэхнапрынт, 1999. – 221 с.

*Гуд, П. А.* Беларускі кірмаш / П. А. Гуд, Н. І. Гуд. – Мінск : Полымя, 1996. – 268 с.

Жыцця адвечны лад. Беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад., прадм. і пер. У. Васілевіча. – Мінск : Мастац. літ., 1998. – Кн. 2. – 607 с.

Земляробчы каляндар: абрады і звычаі / Акад. навук БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; [рэд. кал.: В. К. Бандарчык, К. П. Кабашнікаў, А. С. Фядосік (гал. рэд.) ; уклад., класіфікацыя, сіст. матэрыялаў і камент. А. І. Гурскага; уступ. арт. А. І. Гурскага, А. С. Ліса]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 405 с.

Зямля стаіць пасярод свету… / уклад., прадм., пераклад, бібл. У. Васілевіча. – Мінск : Маст. літ., 1996. – 591 с. – (Беларускія народныя прыкметы і павер'і ; кн. 1.)

Зямная дарога ў вырай/ уклад., прадм., пер. У. Васілевіча. – Мінск : Маст. літ., 1999. – 654 с. – (Беларускія народныя прыкметы і павер'і ; кн. 3.)

Каляндарна-абрадавая паэзія / А. С. Ліс, А. І. Гурскі, В. М. Шарая, У. М. Сівіцкі ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; навук. рэд.А. С. Фядосік. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 515 с.

*Катовіч, А.* Веснавыя святы : навук.-папуляр. выд. : у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук.– Мінск : Мастац. літ., 2005. – Кн. 1. – 359 с.

*Катовіч, А.* Веснавыя святы : навук.-папуляр. выд. : у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук.– Мінск : Мастац. літ., 2005. – Кн. 2. – 413 с.

*Катовіч, А.* Зімовыя святы : навук.-папуляр. выд. / А. Катовіч, Я. Крук. – Мінск : Мастац. літ., 2004. – 119 с.

*Катовіч, А.* Летнія святы : навук. выд. : у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук.– Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009. – Кн. 1. – 368 с.

*Катовіч,* А. В. Мікольская "Свяча" – феномен абрадавай практыкі беларусаў (в. Чарапы Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці) / Аксана Катовіч, Янка Крук. – Мінск : Інбелкульт, 2013. – 93 с.

*Котович, О. В.* Белорусская свадьба в пространстве традиционной культуры / О. Котович, Я. Крук. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2012. – 848 с.

*Крук,* І. І. Следам за сонцам: Бел.нар.каляндар: Дапаможнік для педагогаў дзіцячых дашк. устаноў / І.І. Крук. – Мінск : Ураджай, 1998. – 216 с.

*Крук, Я.* Сімволіка беларускай народнай культуры : навук. выд. / Я. Крук. – Мінск : Беларусь, 2011. – 430 с.

*Кухаронак*, Т. Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т. Кухаронак. – Мінск : Ураджай, 2001. – 238 с.

*Лозка,* А. Беларуская батлейка. Каляндарныя і абрадавыя гульні / А. Лозка. – Мінск : Тэхналогія, 1997. – 183 с.

*Мальдзіс*, А. І. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя: Нарысы быту і звычаяў / А.І. Мальдзіс. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1982. – 256 с.

Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / склад.: І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. : Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2011. – 607 с.

Народны тэатр / уклад. М.А. Каладзінскі. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – 554с.

Народная культура Беларусі: энцыкл. даведнік / рэд. В.С. Цітоў. – Мінск : БелЭН, 2002. – 431 с.

*Сержпутоўскі,* А. К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 302 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т. Б. Варфаламеева, В. І. Басько, М. А. Козенка [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2001–2010. – Т. 1 : Магілёўскае Падняпроўе, 2001. – 797 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т. Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, М. А. Козенка [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2001 – 2010. – Т. 2 : Віцебскае Падзвінне, 2004. – 910 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / аўт. ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеева. – Т. 3: Гродзенскае Панямонне. У 2 кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.]. – Мінск : Выш. шк., 2006. – 608 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / аўт. ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеева. – Т. 3: Гродзенскае Панямонне. У 2 кн. Кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.]. – Мінск : Выш. шк., 2006. – 736 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / аўт. ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеева. – Т. 4: Брэсцкае Палессе. У 2 кн. Кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.]. – Мінск: Выш. шк., 2009. – 863 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / аўт. ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеева. – Т. 5: Цэнтральная Беларусь. У 2 кн. Кн. 1 / В. И. Басько [і інш.]. – Мінск: Выш. шк., 2010. – 847 с.

*Фядотаў*, А.Г. Свята беларускага пісьменства ў школе / А.Г. Фядотаў. – Мінск : Беларуская навука, 2000. – 56 с.

**Арганізацыя самастойнай работы**
**па вучэбнай дысцыпліне "Сучасная святочная культура Беларусі"**

Напісанне творчай работы (рэферата) па вучэбнай дысцыпліне «Сучасная святочная культура Беларусі» спрыяе выкарыстанню атрыманых ведаў у практычнай дзейнасці. У творчай рабоце неабходна выкарыстоўваць дакладныя веды аб сучаснай святочнай культуры, уменне карыстацца першакрыніцамі, структурыраваць матэрыял. Абарона творчай работы рэферата) павінна ўключаць фота-, відэаматэрыялы, тэатралізацыю, акцёрскую манеру выкладання.